койнай працы над будовай сваей нацыянальнай культуры. На гэту працу мы хочам аддаць свае сілы; нам шкада траціць іх на змаганьне, на сваркі з другімі нацыямі. Але мы ня маем права маўчаць і сядзець, злажыўшы рукі, калі нас хто–небудзь хоча пакрыўдзіць: мы тады ўступаць ня можам і будзем заўсягды бараніць наш народ ад крыўды.

„Россия“ піша, быццам даўней мы „шукалі панскай ласкі ў палякаў“. Што гэта зусім сьвядомая няпраўда, можа пераканацца кожын, хто парупіцца пераглядзець „Нашу Ніву“ ад канца да канца. Тры разы нам прыходзілася ваяваць — справядлівей, бараніцца, і то не ад польскага народу, але ад жмені палякаў–памешчыкаў, што жывуць у Беларусі і аб каторых успамінае „Россия“. Першы раз — у самым пачатку жыцьця нашай газэты. Гэта было ў канцы 1906 года і пачатку 1907, калі адбываліся выбары ў II Гас. Думу: тады беларусаў пакрыўдзілі, і ніводзін з кандыдатаў нашых сялян зь Віленскай губ. у Думу не папаў (гл. №№ 4, 5 і 6 за 1907 год[6]). Другі раз прыйшлося выступіць проці палітыкі тутэйшых палякаў, калі яны на славянскім зьездзе ў Празе прадавалі нас расейскім чарнасоценцам і абрусіцелям (гл. № 25 1908 г.[7]). Трэці раз — цяпер, калі у думе кс. Мацяевіч дамагаўся, каб беларусаў–каталікоў вучылі рэлігіі ня ў роднай мове, а па–польску[8].

Здаецца, гэтых прыкладаў досі. Аб іх і „Россия“, і пан „Белорусс“ ня могуць ня ведаць. Не, яны то добра ведаюць, але не аб праўду ім ідзе: яны хочуць як–небудзь пакіраваць усю энэргію і маладыя сілы нашага народу на нацыянальнае змаганьне, а ў тым жа часе — пацiху — рабіць сваю работу. Але гэта ні ім, ні другім ня ўдасца: беларусы ня хочуць быць аружжам у руках расейцаў проці палякаў ані ў руках палякаў проці расейцаў — і ня *будуць*.

Вось такі наш шлях, па каторым мы ішлі, ідзем і будземісьці, і ніякая правакацыя ня зможа зьвясьці нас зь яго.

## З атчоту Крэсьцянскага банку[1]

З думскіх атчотаў ужо ведама, што Крэсьцянскі банк прасіў даць яму права купляць маёнткі не па просьбе мужыкоў, а ў запас. Адначасна з гэтым банк надрукаваў атчот аб сваей рабоце ад 1906 да 1910 году.

У атчоце чытаем перш–наперш, што мэта банку — „паказаць дарогу, па якой народ можа вярнуцца на зямлю, умацавацца на ёй і сам акрэпнуць“. А вось што паказваюць нам лічбы.

Купляючы двары, банк з 1906 году пачаў плаціць за памешчыцкія землі шмат болей, чым яны прадаваліся ў часе ад 1895 да 1905 году. Цана зразу паднялася на 50 працэнтаў (з 71 руб. да 105 руб., лічачы наагул). Яшчэ больш падскочылі цэны за зямлю, каторую мужыкі самі куплялі ад землеўладзельцаў пры помачы банку: з 92 руб. да 136 руб. (наагул). Гэтак банк пераплаціў лішніх 235 мільёнаў руб., каторыя павінны вярнуць яму мужыкі (а частку ўжо вярнулі), купляючы сабе зямлю.

Але і гэта ня ўсё. Банк, даючы за дворную зямлю наагул па 105 руб. за дзесяціну, сам бярэ ад мужыкоў па 125 руб. — значыць, зарабляе на дзесяціне па 20 руб. Яшчэ болей зарабляе банк на прадажы ўдзельных зямель, каторыя Высачайшым указам 12 аўгуста 1906 году былі прызначаны для пашырэньня сялянскіх гаспадарак. Удзельнае ведамства прадало банку 1 мільён 196 тысяч зь лішкам дзесяцін (1 196 032 дзес.), лічачы па 56 руб. за дзесяціну; з гэтага банк ужо перапрадаў мужыкам каля 600 тысяч дзес. і браў ад іх такую цану, як за дворную зямлю: па 125 руб. за дзесяціну або яшчэ болей (да 140 руб.).

Прачытаўшы гэта ў атчоце, ня дзіва, што кожын год банк адбірае ад неакуратных мужыкоў, што купілі праз банк зямлю, іх кавалкі. Такой адабранай зямлі 1 января 1906 году банк меў 51 з палавінай тысячы дзес., а з гэтага часу да нашых дзён прыбыло яшчэ 415 867 дзес.

У Думе аб гэтай палітыцы банку ішла моцная спорка, і правыя[2], і акцябрысты[3] перасілілі другіх, і, як ужо ведама, Дума пастанавіла прадоўжыць права банку скупляць зямлю ў запас.